■ Далёкае – блізкае

# МІКАЛАЙ БУДАЛЬ: ВЯРТАННЕ З НЕБЫЦЦЯ

## Хроніка адной архіўнай папкі

**Мы часта гаворым, што без ведання мінуўшчыны, павагі да яе не будзе і будучыні. Аднак... Многія лёсы нашых землякоў забыліся і ўжо нікога не трывожаць. Нам невядома, што перажылі гэтыя людзі і дзе іх магілы. Пісьменніца Ірына ШАТЫРОНАК (на фота) зацікавілася даўняй сямейнай гісторыяй, якую ведала ад сваёй свекрыві Варвары Канстанцінаўны, і паспрабавала вярнуць з небыцця асобу яе брата, ураджэнца Гродзеншчыны, члена КПЗБ і Беларускай сялянска-рабочай Грамады Мікалая БУДАЛЯ. Прэзентацыя дакументальна-мастацкай аповесці «Мікалай — старэйшы брат Варвары. Хроніка адной архіўнай папкі», урывак з якой быў надрукаваны ў снежаньскім нумары часопіса «Полымя», адбылася ў Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Я. Ф. Карскага.**



— Пэўна, кожная сям'я захоўвае свае тайны, дамашнія легенды, тэмы і драмы, якія пад тоўшчай гадоў даўно пераўтварыліся ў маўклівыя прыпавесці. Як многа недаказаных гісторый! І баюся, што яны так і могуць адысці ў цень забыцця. Таму мне захацелася падзяліцца з чытачамі сваёй прыватнай сямейнай аповесцю, — кажа Ірына Шатыронак.

Пісьменніца спрабавала сябе ў розных літаратурных жанрах, а вось за дакументалістыку ўзялася ўпершыню. Адпаведнага вопыту не мела, але было разуменне, што адказнасць за дакументальны твор яшчэ большая, чым за мастацкую прозу. Таму праца над гэтай кнігай заняла ў Ірыны Шатыронак больш часу, чым над іншымі, — амаль пяць гадоў. Папаўняла дзякуючы розным крыніцам свае гістарычныя веды. Вучылася працы ў архівах, у тым ліку і неабходным фармальнасцям, бо некаторыя дакументы былі з грыфам абмежаванага допуску. Шукала на прасторы былога СССР людзей, якім нешта вядома пра героя яе сямейнай аповесці. І, зразумела, не абмінула яго малую радзіму.

— Мы накіраваліся з мужам у Карэлічы, а адтуль рукой падаць да Ярэмічаў. Сустрэліся з мясцовай настаўніцай Ганнай Уладзіміраўнай Бандарык, адной з апошніх сведак даваеннага жыцця мястэчка. Звярнуліся да тутэйшага святара і папрасілі яго паказаць нам магілкі. Там знайшлі месца, дзе кучна стаялі, урослыя ў зямлю, старыя надмагільныя помнікі з надпісамі «Будаль». Так я пачала вывучаць сямейнае дрэва Будаляў, — распавядае Ірына Шатыронак.

Герой яе аповесці Мікалай Будаль нарадзіўся ў 1902 годзе ў сям'і праваслаўнага святара, член КПЗБ з 1925 года, сакратар партыйнай ячэйкі ў Ярэмічах. Як склаўся яго лёс? Аказалася, што польская паліцыя арыштавала Мікалая ў студзені 1927 года. І амаль год доўжыліся допыты, бо канчатковы спіс арыштаваных па справе ліквідацыі камуністычнай арганізацыі (у ім 75 чалавек) запратакаліраваны лістападам 1927-га. Куды ж этапіравалі Мікалая Будаля? Сляды яго знаходжання Ірыне Шатыронак удалося адшукаць праз два гады архіўнага пошуку ў матэрыялах Гродзенскай следча-карнай турмы за 1928-1929 гады. Туды Будаля разам з іншымі вязнямі, якіх арыштавалі па справе КПЗБ, перавялі з Навагрудскай турмы.

Дарэчы, прэс-сакратар Гродзенскага аблвыканкама Віктар Жалезняковіч прыйшоў на прэзентацыю аповесці не проста як чытач: яго бацька Павел Арсеньевіч сярод арыштаваных польскай паліцыяй праходзіць у адных дакументах з Мікалаем Будалем. Далёкае — блізкае ...

У пратаколе допыту польскай паліцыяй Мікалай Будаль значыцца як студэнт апошняга курса медыцынскага ўніверсітэта. Але якога: у Вільні ці ў Мінску? Гэта для Ірыны Шатыронак пакуль загадка. А вось што стала ёй вядома пра далейшы лёс Мікалая Канстанцінавіча пасля польскага суда і турэмнага зняволення: абмен у СССР як палітвязня, пераезд у Ніжні Тагіл, дзе ён вучыўся, выкладаў у вагонабудаўнічым тэхнікуме і працаваў на металургічным заводзе. У кастрычніку 1937 года Мікалая Будаля арыштавалі па «польскай справе» за «шпіянаж» і неўзабаве расстралялі. У 1956 годзе Ваенная калегія Вярхоўнага Суда СССР спыніла гэтую справу «з-за адсутнасці саставу злачынства».

Даследуючы лёс Мікалая Будаля, Ірына Шатыронак пазнаёмілася і з яго сваякамі, якія жывуць у Расіі. Прычым Людміла Будаль, унучка Мікалая Канстанцінавіча, даслала з Ніжняга Тагіла не толькі ўспаміны яго жонкі Марыі Германаўны (яны надрукаваны ў Кнізе памяці ахвяраў рэпрэсій), але і старыя фотаздымкі. Адзін з іх асабліва ўразіў Ірыну Шатыронак. З далёкага 1935 года на яе быццам глядзелі родныя людзі — муж і малодшы сын. Дзіўнае падабенства...

— Цяпер разумею, чаму пры першым знаёмстве радня мужа глядзела на яго і дружна ўсклікала: «Будаль!» Такія падобныя Мікалай з пляменнікам, родная кроў, — зазначае пісьменніца.

**Пэўна, кожная сям'я захоўвае свае тайны, дамашнія легенды, тэмы і драмы, якія пад тоўшчай гадоў даўно пераўтварыліся ў маўклівыя прыпавесці.**

Ірына Шатыронак удзячная за дапамогу супрацоўнікам архіваў, музеяў, краязнаўцам, журналістам і ў будучыні, магчыма, прадоўжыць кнігу, дапоўніўшы яе падзеямі з партызанскай вайны 1941-1944 гадоў у Налібоцкай пушчы.

— Столькі дадатковай інфармацыі здабыла за апошнія гады, што не магу спыніцца, іду ўсё далей, амаль навобмацак рухаюся па заблытаных лабірынтах памяці. Для мяне самой столькі загадак, столькі пытанняў без адказаў, — кажа Ірына Шатыронак.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■ Спадчына

# ГРАФ ЧАПСКІ ВЯРТАЕЦЦА

**Навіна для аматараў сівой даўніны — ствараецца фонд імя Караля Чапскага. Напомнім шырокаму колу чытачоў, што Ян Караль Аляксандр фон Гутэн-Чапскі быў галавой гарадской управы Мінска тры тэрміны — з 1890 па 1901 год. З яго дзейнасцю звязана з'яўленне тэатра (цяпер імя Янкі Купалы), тэлефоннай станцыі агульнага карыстання, сучасных дарог і гарадскіх вуліц, трамвая-конкі, электрастанцыі на Свіслачы, гарадской публічнай бібліятэкі, піўзавода (цяперашняя «Аліварыя»), прытулку для бяздомных, водаправода і каналізацыі. Намаганнямі маладога мэра, а яму ў той час было крыху за трыццаць, Мінск ператварыўся ў сапраўдную еўрапейскую сталіцу.**



— Фонд імя Караля Чапскага задуманы як некамерцыйная мікрафінансавая арганізацыя, яна будзе займацца шырокім колам пытанняў, у тым ліку і падтрымкай малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, — расказвае адзін з ініцыятараў стварэння Іван Гардзіеўскі, які ўзначальвае мясцовы гісторыка-культурны фонд «Ляліва» і мае адпаведны вопыт. — Але сёння нам важна сказаць, што з дапамогай фонду спадзяёмся зрушыць з месца работу па ўшанаванні памяці самога патрыёта і падзвіжніка Чапскага. Грамадскасць уздымае пытанне аб устаноўцы ў горадзе бюста Каралю Чапскаму і прывядзенні ў парадак месца, дзе пахаваны гарадскі галава. У прыватнасці, прапануецца аднавіць каплічку на радавым пахаванні графаў Чапскіх у Станькаве, бо сёння яно вельмі непрыгляднае. У 1960-я гады, калі капліца, якая стаяла на радавой крыпце, ад часу правалілася, яе проста зраўнавалі з зямлёй. А пад ёю пахавана пяць прадстаўнікоў славутага роду, у тым ліку сам граф Караль Чапскі. Там сёння проста невялікі ўзгорачак, да апошняга часу нават крыжа не было. Летась ад імя грамадскіх арганізацый, ад Саюза прадпрымальнікаў паставілі крыж і на ім напісалі, хто пахаваны. Але Караль Чапскі заслугоўвае, каб яго магіла была аднаўлена належным чынам.

Навуковы кіраўнік Станькаўскага палацава-паркавага комплексу архітэктар Алег Маслееў распрацаваў праект капліцы. Праекты ўстаноўкі бюста і рэстаўрацыі капліцы знаходзяцца на сайце Talaka.by, з імі можна пазнаёміцца і нават падтрымаць матэрыяльна.

Створаны грамадскі камітэт, які звярнуўся ў Мінгарвыканкам з прапановай устанавіць бюст Каралю Чапскаму. Горад папрасіў даць прапановы па бюсце — з прывязкай да мясцовасці і ўказаць крыніцу фінансавання, бо гарадскім бюджэтам не прадугледжана ўстаноўка такіх помнікаў. Што тычыцца месца, то актывісты прапануюць устанавіць бюст Каралю Чапскаму ў скверы на вуліцы Леніна, а побач усталяваць памятны знак. Менавіта там знаходзілася гарадская ўправа.

З мэтай збору сродкаў арганізавана цэлая серыя выязных «круглых сталоў» у Станькаве і Прылуках па тэме "Культурная спадчына як фактар устойлівага развіцця мясцовай тэрыторыі». Для ўдзельнікаў праводзіцца насычаная экскурсія па музеі, з заходам у скарбніцу і на ратонду на беразе возера, а таксама ў царкву, за аднаўленне якой дзякуй ураду і мясцовай суполцы.

Разам з Іванам Гардзіеўскім важнай работай займаецца вялікае кола людзей, не абыякавых да нашай агульнай гісторыі. Сярод іх заслужаны работнік культуры, дырэктар цэнтра народнай творчасці ў Прылуках Леанід Воўчак, стваральнік грамадскага аб'яднання «Прылуцкая спадчына» Інеса Кароль, пісьменнік Анатоль Валахановіч — аўтар яшчэ не выдадзенай кнігі пра Чапскага. Гісторыкі, пісьменнікі, краязнаўцы...

Энтузіястаў падтрымліваюць Саюз юрыдычных асоб «Рэспубліканская канфедэрацыя прадпрымальніцтва», грамадскае аб'яднанне «Мінскі сталічны саюз прадпрымальнікаў і работадаўцаў», Беларускі фонд культуры, Інстытут польскі ў Мінску, БДУ і БДУКІ, БНТУ. Арганізатары спадзяюцца, што падключацца іншыя. І, безумоўна, падкрэсліваюць яны, патрэбны сур'ёзныя інвестары.

Узнаўленне памяці пра слынны род Чапскіх — толькі палова справы, якую хоча ўзяць на сябе фонд. Яго актывісты выступілі з прапановай ажыццявіць праграму «Культурная спадчына краіны — здабытак свету». З адраджэннем — не здзіўляйцеся — Вялікага Княства Літоўскага. Праўда, маецца на ўвазе ўзнавіць яго ў мініяцюры, на тэрыторыі ў 200 гектараў побач з Мінскам (месца ўжо прыгледзелі).

А на мяжы з ВКЛ стварыць вялікі культурна-забаўляльны комплекс для адпачынку гасцей — з прыгожым амфітэатрам, падводным рэстаранам, святломузычным фантанам. І ўсё гэта экалагічна чыстае, бо сілкавацца будзе ад сонечных панэляў. Экалагічнай задумана і сцежка ўздоўж ракі, па якой турысты пасля знаёмства са Станькавам і Прылукамі выйдуць на самы высокі пункт Мінскага раёна — 242 метры. Сядуць там на паветраныя шары і з вышыні птушынага палёту палюбуюцца маленькім Вялікім Княствам Літоўскім.

— Турыстам прапануем сотні маршрутаў па ўсёй Беларусі, будзе арганізаваны трансфер. Да іх паслуг верталёт, легкавая машына, камфартабельны аўтобус, нават запрэжаныя конныя экіпажы. Ідэя — стварыць побач з Мінскам нацыянальны турыстычны брэнд «Беларусь праз вякі» — «Спадчына Вялікага Княства Літоўскага». Пытанні гэтыя прагавораны ў Мінскім аблвыканкаме, Міністэрстве культуры і шэрагу галіновых міністэрстваў, — падтрымаў размову першы віцэ-старшыня грамадскага аб'яднання «Мінскі сталічны Саюз прадпрымальнікаў і работадаўцаў» Анатоль Грамадчанка, які разам з Іванам Іванавічам наведаў «Звязду».

**Грамадскасць уздымае пытанне аб устаноўцы ў горадзе бюста Каралю Чапскаму і прывядзенні ў парадак месца, дзе пахаваны гарадскі галава.**

Між іншым, Іван Гардзіеўскі пабацаў правесці прэс-тур для журналістаў розных выданняў, усё паказаць і расказаць.

**Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ**



**Сядзіба ў Станькаве – адзін з нямногіх помнікаў багатай спадчыны Чапскіх, які захаваўся. Тут нарадзіўся Караль Чапскі.**